РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**АРКБУТА́Н** (франц. arcboutant), вонкавая мураваная паўарка, якая перадае распор скляпення на *контрфорс*. Выкарыстанне А. і контрфорсаў



***Аркбутан** Гервяцкага Троіцкага касцёла.*

дае магчымасць палегчыць канструкцыю сцен, паменшыць сячэнне ўнутраных калон (слупоў), што дазваляе павялічыць пралёт цэнтр. нефа і пашырыць прастору інтэр'ера. Узнік у архітэктуры *готыкі* як канструкцыйны элемент базілікальных храмаў. Шырокае прымяненне атрымаў у мураваным культавым дойлідстве неаготыкі. У Беларусі А. выкарыстоўваўся ў цагляным будаўніцтве каталіцкіх храмаў на Гродзеншчыне ў канцы 19 — пач. 20 ст. (Троіцкі касцёл у в. Шылавічы Ваўкавыскага р-на, 1907—14; *Гервяцкі Троіцкі касцёл*). *Ю.Ю.Захарына.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ